

# Італьянская галіна вальдэнсаў у канцы XII – I ½ XIII стагоддзяў

Аляксандра Валодзіна

# Італьянская галіна вальдэнсаў у канцы XII – I ½ XIII стагоддзяў.

Аляксандра Валодзіна

Сярод змроку, якім каталіцкая царква пакрывала зямлю падчас сярэдніх вякоў, узвышаліся тры гары, да якіх яшчэ даходзіла Боскае святло – гара Арарат, гара гусітаў і вальдэнскія Альпы…[1]" . Ужо з гэтых першых радкоў мы бачым, якое вялікае значэнне надаецца вальдэнскаму руху, і асабліва яго італьянскай галіне.

Тым больш цікавым становіцца высвятленне прычын яго ўзнікнення і ранняга развіцця. Рух, распачаты багатым ліёнскім гандляром Пятром Вальдо, прапагандаваў ідэалы апостальскага жыцця: беднасць, няўхільнае выкананне прадпісанняў Евангелля і, галоўнае, бесперапынная пропаведзь, бо Ісус Хрыстос паслаў сваіх першых вучняў несці слова Божае яўрэям і язычнікам, каб пашыралася вучэнне ісціннае. Вальдо і яго паслядоўнікі адчувалі дакладна такую ж найвышэйшую неабходнасць казаць пра Бога і яго запаветы. Для гэтай мэты Вальдо нават замовіў пераклад Біблії на так званую "народную" мову, каб зрабіць яе больш блізкай да шырокіх народных масаў, больш простай і зразумелай.

Простае жыццё вальдэнсаў, якое так невыгодна дэманстравала ўсю ступень падзення нораваў тагачаснага духавенства, рабіла новае вучэнне неверагодна папулярным. Колькасць яго прыхільнікаў няўхільна памнажалася, што не магло не выклікаць незадаволенасць каталіцкага кліра. Другім адмоўным наступствам шырокага распаўсюджання і вялікай колькасці вальдэнсаў стала размыванне дактрыны і паступовы адыход розных частак некалі адзінага руху ад артадаксальнага каталіцтва самога Вальдо. Натуральна, гэта не спрыяла станоўчаму стаўленню да вальдэнсаў з боку афіцыйнага Рыма і ў рэшце рэшт разам з іншымі прычынамі прывяло да іх адлучэння ад царквы.

Адной з такіх частак, якія адасобіліся на некаторы час ад вальдэнсаў, была італьянская галіна, падрабязны разгляд якой і з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула. Для гэтага павінны быць выкананы наступныя задачы:

- Апісаць асаблівасці італьянскага рэгіёна распаўсюджання вальдызму, якія маглі абумовіць яго спецыфіку;
- высветліць
  - o магчымыя шляхі пранікнення вальдэнсаў у Італію,
  - o іх колькасны склад,
  - o узровень адукацыі.

## Ламбардыя

Рэгіён, які разглядаецца ў дадзенай працы, – Паўночная Італія, ці, як яе называюць у тагачасных крыніцах, Ламбардыя (трэба ўлічыць, што ў Высокім Сярэднявеччы ў гэты рэгіён акрамя ўласна сучаснай італьянскай правінцыі Ламбардыя ўваходзілі Валь д'Аоста, П'емонт, Трэнціна-Альта Адзіджэ, Венета, Фрыулі-Венецыя-Джулья, а таксама частка Лігурыі, Эмільі-Раманьі і нават Тасканы) – меў значную спецыфіку. На той час гэта была найбольш эканамічна і культурна развітая частка заходнееўрапейскага свету.

Менавіта праз гэтыя землі ішоў гандаль з Усходам, які на той час апярэджваў астатні свет ва ўсіх сферах. Безумоўна, значная колькасць тавараў асядала тут. Тое ж датычыць і тэхнічных навінак ды філасофскіх распрацовак, якія абрыўкамі даходзілі праз гандляроў, крыжакоў і пілігрымаў (адзін са шляхоў на Іерусалім вёў праз Італію). Акрамя скарбаў духоўных на гэтых тэрыторыях асядала і значная частка нарабаванага падчас "змагання за веру". Пастаянна адбываліся кірмашы. І на дарозе ў Рым, вечны горад, які на той час, як я ўжо казала, быў ісцінным цэнтрам сусвету, ляжала Паўночная Італія. Цікава таксама тое, што амаль усё вышэйадзначанае датычыцца таксама і Ліёна – радзімы вальдызму. Ён ляжаў на шляху з аднаго з буйнейшых кірмашоў ў Шампані ў Паўночную Італію і з'яўляўся зборным пунктам для крыжакоў з усёй Францыі[2].

Палітычнае развіццё таксама было досыць спецыфічным. З X стагоддзя распачаўся камунальны а рух – змаганне гарадоў за сваю незалежнасць ад феадальных сеньёраў праз атрыманне





*Рымскі Папа Аляксандр III.*

т.зв. камунальнай хартыі. Палітычнае развіццё таксама было досыць спецыфічным. З X стагоддзя распачаўся камунальны[a] рух – змаганне гарадоў за сваю незалежнасць ад феадальных сеньёраў праз атрыманне т.зв. камунальнай хартыі. Але паралельна з гэтым ішоў працэс ператварэння горада ў своеасаблівага калектыўнага феадала ў адносінах да аталяючай яго сельскай мясцовасці – кантада. Адбывалася прымусовае перасяленне феадалаў са сваіх замкаў, якія разбураліся, у горад, што значна павялічвала сацыяльную стракатасць і стварала добрую базу для развіцця розныхрухаў супраціву – як паўстанняў і палітычных пераваротаў, так і ерэтычных сектаў, якія вялі барацьбу не толькі за царкоўную рэформу ў галіне маральнага аблічча кліра, але часам і за палітычную ўладу[b]. Прыкладам таму можа стаць паўстанне патарэнаў у Мілане ў к. XI – пачатку XII стагоддзяў[3]. Праўда, Віс мяркуе, што “партыя патарэнаў была наўмысна створана папам для барацьбы з імперыяй”[4]. Лазінскі ўвогуле бачыць тут барацьбу класаў[5]. Акрамя барацьбы, абумоўленай сацыяльна-эканамічнымі супярэчнасцямі, мы можам назіраць таксама вельмі важнае для ўсведамлення прычын папулярнасці і жывучасці ерэтычных ідэяў у Паўночнай Італіі змаганне паміж гвельфамі (прыхільнікамі папы рымскага) і гібелінамі (прыхільнікамі імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі). Як вядома, у 961 годзе Атон I, германскі імператар, карануецца італьянскай каронай у Павіі, уключаючы тым самым гэты рэгіён у склад імперыі. Гэта, натуральна, стварае значную пагрозу для Папскай вобласці. З іншага боку імперыя, якая напачатку свайго існавання выдавала гарадам прывілеі, з часоў Фрыдрыха I Барбаросы з дынастыі Гогенштаўфенаў пачала іх заўзята абмяжоўваць. Менавіта падчас італьянскіх паходаў апошняга канчаткова фарміруюцца гэтыя партыі. Падтрымку гвельфам, як ужо было адзначана, аказаў папа. Але ж рымскі пантыфік узначальваў не толькі дзяржаву, але і ўвесь каталіцкі сусвет, таму яго праціўнікі, гібеліны, часам дапускалі да ўлады ў падпарадкаваных ім гарадах ерэтыкоў, да прыкладу, умільятаў. Папа таксама быў вымушаны ставіцца да ерэтыкоў трошкі паблажліва, каб не звужаць базу сваіх прыхільнікаў.

Асаблівае стратэгічнае значэнне гарады Ламбардыі набылі з моманту жаніцьбы сына Фрыдрыха Барбаросы Генрыха VI на Канстанцыі Сіцылійскай, у выніку чаго папская дзяржава аказалася цалкам абкружанай уладаннямі Свяшчэннай Рымскай імперыі (з 1189 года – моманту смерці апошняга караля Сіцыліі па мужчынскай лініі нармана Вільгельма II Добрага). Фактычна адзінае, што не дазваляла сталёвым нямецкім абцугам сціснуцца вакол маленькай Царкоўнай дзяржавы, – гэта вольналюбівыя паўночнаітальянскія гарады, якія сваёй барацьбой за захаванне прывілеяў не дазвалялі Фрыдрыху II Гогенштаўфену, пэўна, апошняму з магутных германскіх сярэдня-

**a** *Важнасць гэтага фактару пацвярджаецца таксама тым, што для пазначэнне абшчыны вальдэнсаў у некаторых крыніцах выкарыстоўваецца слова “камуна”.*

**b** *Некаторыя навукоўцы ў адносінах да Францыі абвяргаюць гэтую сувязь. Гл. Erbstößer, M. Ketzer im Mittelalter. S. 107.*

мару "ўзнавіць веліч Рымскай імперыі ў яе былой сіле вечных імператараў, здзейсніць сваю адвечную і бляску"[6]. Але не трэба думаць, што ўсе гарады былі адзінадушныя ў гэтым імкненні. Да прыкладу Мілан і П'ячэнца, ворагі Штаўфенаў, вялі безупыннае змаганне з Крэмонай, якая ў адзін з самых цяжкіх момантаў, яшчэ на этапе зацвярджэння ўлады маладога імператара, аказала яму вырашальную падтрымку[7]. Атрымліваецца, што ў сярэдзіне XIII стагоддзя, як, між іншым, і ў часы Фрыдрыха Барбаросы, італьянскія землі сталі асноўным тэатрам баявых дзеянняў, што не магло станоўча ўплываць на нейкія мерапрыемствы па заспакаенню і ўніфікацыі дадзенага рэгіёна.

Тут варта ўспомніць і знешнепалітычна недальнабачныя суворыя законы Фрыдрыха II супраць ерэтыкоў, што паднімала супраць яго хвалю паўстанняў. Але трэба мець на ўвазе, што гэты манарх успрымаў абразу Бога (іншымі, натуральна, сам ён дазваляю сабе парушаць клятвы, падымаць руку на святароў і мець стасункі, часам вельмі блізкія, з мусульманамі) як абразу сябе, што, натуральна, каралася вельмі жорстка[8] (да прыкладу, равенскі эдыкт).

## Італьянскія вальдэнсы

Як ужо было зазначана, Паўночная Італія (зона першапачатковага распаўсюджання руху) была вельмі схільная да спараджэння і культывавання ерасяў самага рознага кшталту. І натуральна, што вальдэнскія ідэі, трапіўшы на такую ўрадлівую глебу, не маглі не толькі не расквітнець, але і не пераняць некаторых ідэй у сваіх папярэдні-



каў. Такім чынам, варта будзе акрэсліць магчымыя шляхі пранікнення вальдэнсаў у Італіі, іх колькасны склад і ўзровень адукацыі, а таксама запазычанні асноваў іх веры з вучэнняў іншых ерэтычных сектаў.

1. Лагічна будзе пачаць з магчымых шляхоў пранікнення:

a. большасцю даследчыкаў выказваецца меркаванне аб тым, што сам Вальдо па дарозе назад з Рыма, дзе ён сустракаўся ў 1179 годзе на III Латэранскім саборы з папам Аляксандрам III, мог прапаведаваць сярод мясцовага насельніцтва[9], распаўсюджваючы такім чынам свой пераклад Бібліі на "народную" мову.

b. Наступны раз вальдэнсы ўпамінаюцца ўжо ў 1184 годзе падчас Веронскага сабора ў буле папы Луцыя II "Ad Abolendam" разам з умільятамі. Так ці інакш, але Альпы на той час зусім не з'яўляліся такой ужо каменнай сцяной, як нам часам уяўляецца, і веянні з розных частак Заходняй Еўропы пранікалі ва ўсе яе куткі, а гледзячы на спецыфіку Паўночнай Італіі нельга нават уявіць, што якая-небудзь ідэя абміне гэты рэгіён.

2. Наступнае, што варта разгледзіць, – гэта распаўсюджанне



Рымскі Папа Луцый II.

2. італьянскіх вальдэнсаў. Паколькі асноўнымі крыніцамі па гэтай праблеме з'яўляюцца лісты папы Інакенція III, адрасаваныя біскупам канкрэтных месцаў, і Рэскрыпт[c] (па імёнах удзельнікаў перапіскі і сустрэчы), то асноўнае даследаванне будзе грунтавацца менавіта на гэтых дадзеных. Асобныя звесткі атрыманы мною і з навуковай літаратуры. Атрымліваецца, што ерассю былі закрануты наступныя гарады Італіі: Мілан, Верона, П'ячэнца, Павія, Генуя, Бергама, Брэшыя, Турын, Фларэнцыя, Фіенца (натуральна, са сваімі ваколіцамі), а таксама раён возера[d].

3. Колькасць. Гэта – адно з самых спрэчных пытанняў ва ўсёй гісторыі вальдэнсаў. Прычыны гэтага разгледжаны ў мінулай працы. Для больш позніх часоў існуюць матэрыялы допытаў інквізіцыі, але для дадзенага перыяду такіх не існавала. Навукоўцы або пазбягаюць увогуле якіх-небудзь лічбаў, або спасылаюцца на Сальва Бурчы і пішуць "6000 чалавек"[10]. Асабіста мне сустрэлася адна заўвага ў лісце да архібіскупа







*Мал. 1: Рассяленне вальдэнсаў да XII ст.*

*Мал. 2:Рассяленне вальдэнсаў у XII-XV ст.*

**c** *Маецца на ўвазе Рэскрыпт ерэсіярхаў Ламбардыі да ерэтыкоў Алеманіі, пераклад каторага змешчаны ў нумары 5).*

**d** *Адам Блэр называе нават Калабрыю (Blair, A. History of the Waldenses: with an introductory sketch of the history of the Christian Churches in the south of France and north of Italy, till these churches submitted to the pope, when the Waldenses continued as formerly independent of the papal see. P. 253), але мне падаецца, што на той час вальдэнсы не прасунуліся так далёка на поўдзень.*

Мілана пра тое, што там жывуць “амаль 100 ізноў далучаных”[11]. Мяркую, што вальдэнсаў было больш, бо не ўсе захацелі вярнуцца ў лона царквы. Да таго ж жанчын і дзяцей маглі і не лічыць, а такія пераходы ахаплівалі, як правіла, цэлыя сем’і.

4. Адукацыйны ўзровень. Прамых сведчанняў датычна гэтага прамежку не захавалася, таму пра высокі ўзровень членаў секты[12] мы можам рабіць высновы абапіраючыся на ўскосную інфармацыю.

a. Адной з асноўных задач вальдэнсаў была пропаведзь, што, натуральна, вымагала даволі грунтоўных ведаў, якія дэманстраваліся падчас розных дыспутаў, перш за ўсё – з катарамі.

b. У Рэскрыпце ёсць згадка пра “нашых дактароў”, якія займаюцца вывучэннем Айцоў Царквы – таксама даволі яскравае сведчанне неслабой тэалагічнай падрыхтоўкі.

c. Сам Рэскрыпт напісаны правільнай лацінай, што паказвае выдатную адукацыю яго аўтараў, а таксама тое, што італьянскія вальдэнсы добра абазнаныя ў Свяшчэнным Пісанні, бо яно было ім больш даступна і на больш дакладным лацінскім тэксце[13]. Тое ж датычыцца і цытуемых у Рэскрыпце ўрыўкаў з ліста ўльтрамантанаў (так называюць “французскіх” братоў)[14].

Адразу трэба зазначыць, што калі мы кажам пра вылучэнне “італьянскіх братоў” з агульнай вальдэнскай плыні, мы ні ў якім разе не звяртаемся да тэрытарыяльнага фактара. Гэта пацвярджаецца геаграфіяй імёнаў ультрамантанаў Рэскрыпта – амаль усе яны паходзяць з Італіі, між тым як сярод “італьянцаў” ёсць тры французы. “Геаграфічная” назва плыні абумоўлена паходжаннем споведзі веры, а не яе распаўсюджаннем. Таксама варта мець на ўвазе, што гэта датычыцца групы вандроўных прапаведнікаў, а не аселых вернікаў[15].

Дата раздзялення, або “схізмы” – 1205 год – даволі ўмоўная і пастаўлена паводле сведчанняў Сальва Бурчы[16].

Падставамі для раздзялення маглі стаць:

- Аддаленасць ад цэнтра вальдэнства – Паўднёвай Францыі і слабасць зносінаў з ім;
- Насельніцтва Ламбардыі валодала большымі арганізацыйнымі навыкамі, а пастаяннае суседства з іншымі сектамі рабіла абасабленне неабходным17 ;
- А магчыма, абасабленню спрыялі асаблівасці вучэння, якія будуць пералічаны далей. Матывы падобнага падзела рэстаўруюцца часткова па сведчаннях усё таго ж Рэскрыпта, які і расказвае пра спробу пераадолець гэты падзел, а таксама па сведчаннях Сальва Бурчы і некаторых тлумачэннях падстаў такіх пастулатаў, прыведзеных у сваім трактаце Дурандам з Оскі. Прычын гэтых тры[18]:

- Вальдэнсы лічылі магчымым сумяшчэнне апостальскага жыцця з ручной працай, Вальдо ж быў строга супраць гэтага: “*Вальдо казаў, што калі наконт усяго астатняга былі мір і згода паміж ім і італьянскімі братамі, акрамя толькі злучэнняў працоўных, якія ў тыя часы былі ў Італіі, калі, такім чынам, яны (італьянцы – А.В.) з імі (злучэннямі працоўных – А.В.) не расстануцца, міру з ім мець яны не маглі*”[e]. З аднога боку Вальдо можна зразумець – перад яго вачамі быў яскравы прыклад клюнійскіх кляштараў, якія квітнелі пасля рэформы[f] і зусім не спрыялі выкананню абету беднасці, і ён баяўся паўтарыць іх лёс. З іншага – Апостал Павел не цураўся працы[19].
- Ламбардцы выбралі сабе пажыццёвага старшыню Джавані з Ронка па мянушцы Добры [20]. *“Вальдо казаў, што ён не хоча, каб іншы ў абшчыне ўльтрамантанскай ці італьянскай між братоў меў перавагу ні пры жыцці, ні пасля смерці”*. Дуранд тлумачыць гэта тым, што адзіным правадыром з’яўляецца Ісус Хрыстос, і ніхто не можа заняць яго месца.
- Італьянцы прызначалі сваіх святароў для здзяйснення еўхарыстыі: *“Святара, узведзенага ў сан свяшчэннаслужыцеля па прызначэнню Хрыста”*; ультрамантанаў жа задавальняў каталіцкі клір: *“Святар, узведзены ў сан Рымскай царквой, ... калі возьме хлеб і віно і благаславіць іх у памяць цела і крыві Гасподняй, мы верым, што пасля благаслаўлення ад яго словаў стане цела і кроў Гасподня*”. У прынцыпе, такі погляд “французаў” цалкам натуральны, бо трэба памятаць, што Вальдо да апошніх сваіх дзён лічыў сябе сапраўдным каталіком – нездарма ж ён хадзіў у Рым. Трэба адзначыць, што апошнія два палажэнні былі замацаваны на дыспуце ў Пам’е ў 1207 годзе[21].

Зараз я коратка пералічу дактрынальныя палажэнні вальдэнсаў, якія не сустракаюцца або прама супярэчаць Рэскрыпту (непасрэдна сам Рэскрыпт мяркуецца быць прааналізаваным у наступным нумары).

Спачатку пералічым спіс, прыведзены ў лісце

e *Курсівам пазначаны цытаты з майго перакладу Рэскрыпту.*

f *Некаторыя навукоўцы ўвогуле бачаць у грэгарыянскіх рэформах карані ерасяў, да прыкладу Гергей, Е. История папства. С. 131-132.*

біскупа П'ячэнцы Ардыцыа, паколькі па часе яго ліст (1197-1199) нават папярэднічае "схізме":

- Таінствы можа здзяйсняць кожны чалавек, нават жанчына[22];
- Не вызнаюць месаў, міласціны і малітваў, якія могуць паўплываць на лёс памерлых (аўтаматычна ідзе адмаўленне Чысцеца, дагмат датычна каторага ўсталёўваецца якраз у гэты час);
- Дапускаецца развод у тым выпадку, калі адзін з пары жадае стаць вандроўным прапаведнікам ці манахам/манахіняй;
- Не вызнавалі аўтарытэту Айцоў Царквы, папскіх булаў і царкоўных парадкаў[23].

З іншых крыніц мною выбраны толькі тыя палажэнні, якія не супадаюць з вышэйпрыведзенымі:

- Адмаўленне аўтарытэту святых;
- Адмаўлення ўсіх таінстваў, акрамя хрышчэння, прычасця і споведзі (але адпушчэнне грахоў таксама немагчыма);
- Іх царква – таемная і з'яўляецца сапраўднай паслядоўніцай апосталаў[24];
- Адмаўленне ад ваеннай службы;
- Адмаўленне ад прыватнай уласнасці;
- Адмаўленне прымушэння да працы[25];
- Паўторнае хрышчэнне[26];
- Забарона клятвы;
- Традуцыянізм;
- Непрызнанне аўтарытэту каталіцкай царквы, якая "забрудзіла" сябе з часоў Сільвестра[27].

Цікава будзе згадаць пра групу ізноў далучаных пад кіраўніцтвам Бернарда Прыма з Крэмоны[28] і Гульельма Арнаўда, вядомых пад іменем "бедныя ізноў далучаныя".

Ісцінна, беднасць – вызначальная дактрынальная асаблівасць часу. Так называліся ўсе вядомыя галіны вальдэнсаў:

- "бедныя з Ліёна" – асноўная група паслядоўнікаў Вальдо,
- "бедныя ламбардцы" – італьянская галіна,
- "бедныя каталікі" Дуранда з Оскі,
- "бедныя ізноў далучаныя" Бернарда Прыма,

а таксама:

- умільяты – "прыніжаныя",
- патарэны – ад назвы беднага квартала Мілана,
- "poverelli" – "бедненькія" (адна ў назваў паслядоўнікаў св. Францыска)[g].

Відаць, разрыў жыцця духавенства з жыццём апосталаў дасягнуў напраўду жахлівых памераў. Вяртаючыся да Бернарда зазначу, што ягоны зварот датуецца 1210 годам і даследуецца ў асноўным па булах усё таго ж папы Інакенція III. Апошняе, да чаго варта звярнуцца – пытанне вяртання ламбардцаў у агульнае рэчышча вальдэнскага руху. Адбываецца гэта, паводле сведчанняў Сальва Бурчы, недзе напрыканцы XIII стагоддзя[29], бо ўжо дамініканскія аўтары не спыняюцца на вылучэнні нейкіх унутраных плыняў у вальдызме. На маю думку, асноўнай прычынай з'яўляецца ўзмацненне пераследу ерэтыкоў (эдыкты Фрыдрыха II Гогенштаўфена, дзейнасць інквізітараў, крыжовы паход супраць альбігойцаў), што прывяло, па-першае, да радыкалізацыі ўльтрамантанаў і прыпадабнення іх такім чынам да італьянцаў (больш крайніх), а па-другое – да вымушанай кансалідацыі руху, які апынуўся абкружаны з усіх бакоў ворагамі. Хаця, з іншага боку, гэта было актуальна ўжо ва ўмовах анафемы 1215 года[30]. Адзінае прыемнае выключэнне з шэрагу розных ганенняў – дамова графа Люцэрны з герцагам Савойскім ад 1233 года аб свабоднай споведзі вальдызму[31].

Такім чынам можна зрабіць наступныя высновы:

I. Вальдэнскія ідэі пранікл ў Паўночную Італію напрыканцы XII стагоддзя праз пропаведзь самога Вальдо і яго паплечнікаў.

II. Дадзены рэгіён у выніку свайго геаграфічнага становішча, эканамічнага і палітычнага развіцця, а таксама надзвычай стракатага рэлігійнага складу быў падрыхтаваны да ўспрыняцца гэтых ідэй.

III. Новае ерэтычнае вучэнне даволі хутка распаўсюдзілася па гарадах поўначы і часткова цэнтру краіны.

IV. Колькасны склад італьянскіх вальдэнсаў дакладна не вызначаецца, але ў любым выпадку не перавышае некалькіх тысяч чалавек.

V. Адукацыйны ўзровень ламбардцаў быў даволі высокім.

Між тым, як бачна нават з гэтага невялікага артыкула, у гісторыі вальдызму, нягледзячы на паўтысячагадовую гісторыю вывучэння, застаюцца белыя плямы, якія яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

g *Некаторыя даследчыкі нават бачаць сувязь паміж вальдэнсамі і францысканцамі, да прыкладу Volpe, G. Movimenti religiosi e sette ereticali nella societa medievale italiana: nella societa medievale italiana (secoli XI-XIV) / G. Volpe, C. Violante. Donzelli Editore, 1997. P. 59; McCallum, D.H. The Waldensian Movement from Waldo to the Reformation / D.H. McCallum. 1978. P. 11.*

## Примечания:

[1] Charvaz, A. Origine dei Valdesi e carattere delle primitive loro dottrine / A. Charvaz. G. Bocca, 1838. 512 p.

[2] Erbstößer, M. Ketzer im Mittelalter / M. Erbstösser. Leipzig: Ed. Leipzig, 1984. S. 105.

[3] Гісторыя сярэдніх вякоў. Заходняя Еўропа і Візантыя: Вучэб. дап. для студ. выш. навуч. устаноў па спец. "Гісторыя":У 2 ч. Ч.1 / В.А.Фядосік, І.А.Еўтухоў, А.А.Прохараў і інш.; Пад рэд. В.А.Фядосіка, І.А.Еўтухова. Мінск: БДУ, 2003. С. 236.

[4] Вис, Э.В. Фридрих II Гогенштауфен / Э.В. Вис; пер. с нем. Е.Б. Каргиной. М.: АСТ, 2005. С. 137.

[5] Лозинский, С.Г. История папства / С.Г. Лозинский. Смоленск: Русич, 2004. С. 149-151.

[6] Эпоха крестовых походов / под ред. Э. Лависса и А. Рамбо. Смоленск: Русич, 2005. С. 126

[7] Вис, Э.В. Фридрих II Гогенштауфен. С. 78.

[8] Тамсама 135-139.

[9] Papini, C. Valdo di Lione e i poveri nello spirito: il primo secolo del movimento valdese (1170-1270) / C. Papini. Torino: Claudiana, 2002. P. 222; Audisio, G. Waldenser: die Geschichte einer religiösen Bewegung. S. 26; Jones, W. The History of the Waldenses: Connected with a Sketch of the Christian Church from the Birth of Christ to the Eighteenth Century / W. Jones London, 1816. P. 12.

[10] Papini, C. Valdo di Lione e i poveri nello spirito. P. 236.

[11] Patrologia Latina Database. – 1 электр. апт. дыск (DVD-ROM).

[12] Skrzypiec, K. Sekretna Wieczerza czyli o heretykach budzących sympatię / K. Skrzypiec // Mówią wieki. – 2009. – 04/09(541).- S. 33-37.

[13] Карсавин, Л. Очерки средневековой религиозности. С. 126.

[14] Падрабязней па гэтаму пытанню гл. Patschovsky, A. The Literacy of Waldensianism from Valdes to c. 1400 / A. Patschovsky // Heresy and literacy, 1000-1530 / ed. by P. Biller and A. Hudson. Cambridge: Cambridge Univ. Pr., 1996. P. 112-136.

[15] Карсавин, Л. Очерки средневековой религиозности. С. 117.

[16] Cameron, E. Waldenses: Rejections of Holy Church in Medieval Europe / E. Cameron. Blackwell Publishing, 2001. P. 39.

[17] Карсавин, Л. Очерки средневековой религиозности. С. 122.

[18] Audisio, G. Waldenser: die Geschichte einer religiösen Bewegung. S. 31.

[19] Дзн 18.

[20] Papini, C. Valdo di Lione e i poveri nello spirito. P. 235.

[21] Audisio, G. Waldenser: die Geschichte einer religiösen Bewegung. S. 32.

[22] Падрабязней гл. Shahar, S. Women in a Medieval Heretical Sect: Agnes and Huguette the Waldensians / S. Shahar, Y. Lotan. Boydell & Brewer, 2001. 184 p.

[23] Паводле Papini, C. Valdo di Lione e i poveri nello spirito. P. 238.

[24] Лортц, Й. История церкви.

[25] Эпоха крестовых походов. С. 252.

[26] Audisio, G. Waldenser: die Geschichte einer religiösen Bewegung. S. 30.

[27] Cameron, E. Waldenses: Rejections of Holy Church in Medieval Europe. P. 46-47.

[28] Erbstößer, M. Ketzer im Mittelalter. S. 112.

[29] Papini, C. Valdo di Lione e i poveri nello spirito. P. 297.

[30] Audisio, G. The Waldensian dissent: persecution and survival, c. 1170-c. 1570 / G. Audisio. Cambridge University Press, 1999. 234 p. 3̇Electronic resourse8́. P. 27.

[31] Armitage, T. A History of the Baptists: Traced by Their Vital Principles and Practices, from the Time of Our Lord and Saviour Jesus Christ to the Year 1886 / T. Armitage. The Baptist Standard Bearer, Inc., 2001. P. 300.

## Спіс крыніц і літаратуры:

1. Біблія. Кнігі Святога Пісаньня Старога і Новага Запавету. Кананічныя ў беларускім перакладзе. 3̇Electronic resourse8́. – 19.02.2008. – Mode of access: http://knihi.com/biblija/.
2. Beiträge zur Sektengeschichte des Mittelalters: Dokumente vornehmlich zur Geschichte der Valdesier und Katharer / I. Döllinger; T. 2. - Darmstadt: Wiss. Buchges., 1968 = 1890. – 736 s. - 3̇Electronic re sourse8́.
3. Concilia oecumenica et generalia Ecclesiae catholicae - Concilium Lateranense III a. 1179. - 3̇Electronic resourse8́.
4. Concilium Lateranese IV a. 1215. – Roma, 2008. - 3̇Electronic resourse8́.
5. Heresies of the High Middle Ages. Selected sources translated and annotated / W.L.

5. Wakefield, A.P. Evans. – New York and London, 1969. - ǯElectronic resourseȣ.
6. Patrologia Latina Database. – 1 электр. апт. дыск (DVD-ROM).
7. Quellen zur Geschichte der Waldenser / hrsg. von A. Patschkovsky und K.-V. Selge. – Gütersloh: Gütersloher Verlagshaus Gerd Mohn, 1973. – 263 s. - ǯElectronic resourseȣ.
8. Вис, Э.В. Фридрих II Гогенштауфен / Э.В. Вис; пер. с нем. Е.Б. Каргиной. – М.: АСТ, 2005. – 378 с.
9. Гергей, Е. История папства / Е. Гергей; пер. с венгр. О.В. Громова. - М.: Республика, 1996. - 463 с.
10. Гісторыя сярэдніх вякоў. Заходняя Еўропа і Візантыя: Вучэб. дап. для студ. выш. навуч. устаноў па спец. "Гісторыя":У 2 ч. Ч.1 / В.А.Фядосік, І.А.Еўтухоў, А.А.Прохараў і інш.; Пад рэд. В.А.Фядосіка, І.А.Еўтухова. - Мінск: БДУ, 2003. – 269 с.
11. Карсавин, Л. Очерки средневековой религиозности / Л. Карсавин // История ересей: [сб.] / сост. А. Лактионов. – М.: АСТ, 2007. – С. 9-266.
12. Лозинский, С.Г. История папства / С.Г. Лозинский. – Смоленск: Русич, 2004. – 464 с.
13. Лортц, Й. История церкви / Й. Лортц. - М.: Христианская Россия, 1999.
14. Эпоха крестовых походов / под ред. Э. Лависса и А. Рамбо. - Смоленск: Русич, 2005. – 627 с.
15. Audisio, G. The Waldensian dissent: persecution and survival, c. 1170-c. 1570 / G. Audisio. - Cambridge University Press, 1999. – 234 p.
16. Audisio, G. Waldenser: die Geschichte einer religiösen Bewegung / G. Audisio. - München: Beck, 1996. – 281 s.
17. Blair, A. History of the Waldenses: with an introductory sketch of the history of the Christian Churches in the south of France and north of Italy, till these churches submitted to the pope, when the Waldenses continued as formerly independent of the papal see / A. Blair. – Edinburgh, 1832.
18. Cameron, E. Waldenses: Rejections of Holy Church in Medieval Europe / E. Cameron. - Blackwell Publishing, 2001. – 336 p.
19. Charvaz, A. Origine dei Valdesi e carattere delle primitive loro dottrine / A. Charvaz. - G. Bocca, 1838. – 512 p.
20. Erbstößer, M. Ketzer im Mittelalter / M. Erbstösser. - Leipzig: Ed. Leipzig, 1984. – 235 s.
21. Jones, W. The History of the Waldenses: Connected with a Sketch of the Christian Church from the Birth of Christ to the Eighteenth Century / W. Jones – London, 1816. – 444 p.
22. McCallum, D.H. The Waldensian Movement from Waldo to the Reformation / D.H. McCallum. – 1978. – 22 p. - ǯElectronic resourseȣ.
23. Papini, C. Valdo di Lione e i poveri nello spirito: il primo secolo del movimento valdese (1170-1270) / C. Papini. – Torino: Claudiana, 2002. – 549 p.
24. Patschovsky, A. The Literacy of Waldensianism from Valdes to c. 1400 / A. Patschovsky // Heresy and literacy, 1000-1530 / ed. by P. Biller and A. Hudson. - Cambridge: Cambridge Univ. Pr., 1996. – P. 112-136.
25. Shahar, S. Women in a Medieval Heretical Sect: Agnes and Huguette the Waldensians / S. Shahar, Y. Lotan. - Boydell & Brewer, 2001. – 184 p.
26. Skrzypiec, K. Sekretna Wieczerza czyli o heretykach budzących sympatię / K. Skrzypiec // Mówią wieki. – 2009. – 04/09(541).- S. 33-37.
27. Volpe, G. Movimenti religiosi e sette ereticali nella societa medievale italiana: nella societa medievale italiana (secoli XI-XIV) / G. Volpe, C. Violante. – Donzelli Editore, 1997. – 267 p.